2. Оперативно принимать решения и управлять сложными процессами в студенческой среде.
3. Сформировать доверительное отношение студента к куратору.
4. Достигнуть совершенства каждому преподавателю.

УДК 378.1:82

Н.Я. Савіцкая, ст. выкладчык

## ЛІТАРАТУРНЫ КЛУБ ЯК АДЗІН СА СРОДКАЎ ВЫХАВАННЯ ГАРМАНІЧНА РАЗВІТАЙ АСОБЫ (З ВОПЫТУ РАБОТЫ)

In the article the author gives the results of the five-year creative work in the literary club «Vetlitsa» of the belorusian state Technical Un. (BSTU), pays attention to the forms and methods of work, which help upbrining of the positive in person.

Выхаванне ўсебакова развітай асобы патрабуе наладжвання розных відаў творчай дзейнасці студэнтаў, стварэння клубаў па інтарэсах і інш. Адным з відаў такой дзейнасці можа быць літаратурны клуб. У БДТУ дзейнасць літаратурнага клуба пачынаецца з 1997 года. Пяцігадовы вопыт творчай, арганізацыйна-выхаваўчай, адукацыйна-эстэтычнай дзейнасці дазваляе зрабіць пэўныя падагульненні, дае магчымасць падзяліцца здабыткамі творчай працы.

У бягучым навучальным годзе літаратурнаму клубу БДТУ «Ветліца» споўнілася 6 гадоў. Ідэя стварэння клуба ўзнікла ў 1994 г., а актыўная дзейнасць пачалася з верасня 1997 г. Неабходнасць стварэння клуба грунтавалася на тым, што ва універсітэце шмат студэнтаў і супрацоўнікаў, якія валодаюць майстэрствам прыгожага пісьменства і якім цікава было б пазнаёміцца як з творчасцю калег, так і прэзентаваць свае творы зацікаўленай аўдыторыі.

Літаратурны клуб – від творчай дзейнасці па інтарэсах, і ў сваёй працы можа выкарыстоўваць і спалучаць шматлікія формы дзейнасці, напрыклад: выступленні перад вялікай і малой аўдыторыяй, удзел у літаратурных конкурсах, вечарынах, выпуск насценных літаратурных газет, літаратурнага альманаха, камп'ютэрнага варыянта ўласнага збору твораў, сустрэчы са знакамітымі і маладымі пісьменнікамі, літаратурнымі суполкамі, аб'яднаннямі, клубамі і інш. Прывядзём прыклады найбольш распаўсюджаных формаў працы, якія выкарыстоўваліся ў літаратурным клубе.

**ВІДЫ ДЗЕЙНАСЦІ**

**І. Пасяджэнні клуба:**

1. Знаёмства з членамі клуба і іх творчасцю.
2. Абмеркаванне прэзентаваных твораў.
3. Выбар твораў да выдання ў альманаху.
4. Тэматычныя: «Хрысціянскія матывы ў творчасці беларускіх паэтаў» і інш.
5. Юбілейныя: «Да 120-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа».
6. Падрыхтоўка насценных газет: вызначэнне тэматыкі і назвы нумара газеты, падборка матэрыялаў, абмеркаванне дызайну, выбар афарміцеля, афармленне.
7. Пасяджэнні-рэпетыцыі: выбар твораў, спроба прэзентацыі, складанне праграмы (літаратурная ці музычна-літаратурная кампазіцыя), рэпетыцыя кампазіцыі, выступленне.
8. Літаратурная вучоба: агульныя пытанні, індывідуальная праца з аўтарамі твораў.
9. Прэзентацыя творчай асобы.

**II. Конкурсы:**

1. Конкурс чытальнікаў вершаў «Да 200-годдзя з дня нараджэння Адама Міцкевіча».
2. Удзел у фестывалях БДТУ «Студэнцкая вясна-2002», «Студэнцкая вясна-2003» у жанрах: аўтарская песня, аўтарскі верш, мастацкае чытанне.
3. Удзел у рэспубліканскіх творчых конкурсах маладых літаратараў.
4. Тэматычныя конкурсы сачыненняў.
5. «Мой радавод».
6. Ці лёгка стварыць казку (конкурс казак)?

**III. Сустрэчы з паэтамі і літаратурнымі клубамі:**

1. З народным паэтам Беларусі Нілам Гілевічам.
2. З паэтэсай Валянцінай Аколавай.
3. З творчай суполкай «Бум–бам–літ» і прадстаўнікамі часопіса «Першацвет» (Серж Мінскевіч, Алесь Туровіч, Ірына Туровіч).
4. З прадстаўнікамі літаратурнага клуба БДУ Вольгай Коваль і Кацярынай Вайтовіч.
5. З літаратурным клубам БДАТУ (абмен вопытам).
6. З паэтам Анатолем Вярцінскім.
7. З мастацка-літаратурным клубам г. Лепеля «Выток».

**IV. Выступленні:**

1. На сустрэчах з паэтамі: Н. Гілевічам, Р. Барадуліным, В. Аколавай, Л. Дранько-Майсюком, Г. Бураўкіным, В. Іпатавай, І. Багдановіч, А. Пісьмянковым, С. Законнікавым, А. Зэкавым, І. Цітаўцом, А. Вярцінскім, З. Марозавым і інш.
2. На вечарынах «У вянок песнярам», «Да 120-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа» (у актавай зале БДТУ, у СШ № 140 г. Мінска), «Да 70-годдзя Н. Гілевіча» (у касцёле святых Сымона і Алены).
3. На свяце горада Мінска ў Міхайлаўскім скверы.
4. У куратарскіх групах (прэзентацыя творчай асобы). Выступілі ў 5 групах ф-таў ХТіТ, ТАР (1–4 курс).

**V. Насценныя газеты:**

1. Павевы гісторыі і кахання (афарміла Настасся Уласік – ТАР).
2. Восеньскія матывы (афарміла Яўгенія Пліско – ВСіП).
3. З Новым годам! (афарміла Алена Карпук – ВСіП).
4. «У вянок песнярам» (афарміла Алена Карпук – ВСіП).
5. «Валянцінка» (да дня кахання) (афарміла Яўгенія Пліско – ВСіП).
6. 8 Сакавіка (афарміла Надзея Досіна – ЛГФ).
7. Дзень жарту (да 1 красавіка) (афарміла Алена Карпук – ВСіП).
8. «Светлай паэзіі чыстыя гукі» (афармілі Алена Карпук і Яўгенія Пліско – ВСіП).

**VI. Камп'ютэрныя варыянты зборнікаў вершаў** (рыхтуюцца яшчэ 10).

**VII. Літаратурна-мастацкі альманах «AVE»** (падрыхтаваны да выдання першы выпуск, рыхтуюцца другі і трэці выпускі).

**VIII. Літаратурныя вечарыны:**

1. «Вечар паэзіі і музыкі» (інтэрнат № 1, 1997 г.).
2. «Вечар зорны, вечар знічны – вечары ў Тэхналагічным» (прысвечаны творчасці Максіма Багдановіча, з ускладаннем кветак да помніка) (1997 г.).

3. «У вянок песнярам» (Да 120-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа). Сустрэча з сынам Я. Коласа Міхасём Міцкевічам і супрацоўнікам музея Іванам Курбекам.

4. Лірычныя пятніцы ў Тэхналагічным (шматлікія сустрэчы з беларускімі паэтамі).

**IX. Канферэнцыя «Я душою ў Радзіме разліўся».** Да 200-годдзя Адама Міцкевіча (Т.М. Федарцова).

**X. Сцэнарыі.**

1. Па творчасці М. Танка (Т.М. Федарцова).
2. Па творчасці М. Багдановіча (Т.М. Федарцова).

**XI. Літаратурна-музычныя кампазіцыі** да фестывалю БДТУ «Студэнцкая вясна-2002», «Студэнцкая вясна-2003».

**XII. Матэрыялы аб жыцці і творчасці паэтаў.**

1. Максіма Багдановіча (Н.Я. Савіцкая).
2. Францішка Багушэвіча (Н.Я. Савіцкая).

**XIII. Прэзентацыя** літаратурнага клуба ў газеце «Тэхнолаг» (Н.Я. Савіцкая).

Прыведзены спіс формаў і відаў дзейнасці дае падставы паразважаць і пра метады працы. Найбольш распаўсюджаны метад – **гутарка**, якая можа быць індывідуальнай або групавой. Менавіта дзякуючы папярэдняй гутарцы можна вызначыць жаданне супрацоўнічаць з літаратурным клубам, удзельнічаць у мерапрыемствах, выносіць свае творы на абмеркаванне і г. д. Карацей кажучы, усё пачынаецца з гутаркі, якая можа адразу наладзіць добрыя адносіны, падштурхнуць да творчасці, да супрацоўніцтва. Галоўнае, каб быў дыялог, каб прамоўленае слова было пачута і ўспрынята, каб стала зразумела, што тут аднадумцы, што ў клубе можна выказаць свае патаемныя думкі, пачуцці, перажыванні, успрыманне свету (а яно ў кожнага сваё) і быць зразуметым, пачутым, не абсмяяным, успрынятым такім, які ты ёсць.

Творчасць – гэта паказчык індывідуальнага свету асобы. Вельмі важна для многіх, асабліва маладых людзей, пераадолець сябе і адкрыцца перад усімі, паколькі, на думку вучоных, сярод беларусаў больш інтравертаў, г. зн. людзей, якія заглыблены ў свой унутраны свет і часта з'яўляюцца пасіўнымі ў адносінах да знешніх падзей. Вядома, што многія маладыя людзі (асабліва на першых курсах) з цяжкасцю адаптуюцца да новага асяроддзя, адчуваюць сябе няўпэўнена, адчуджана.

Заглыбленасць у свае думкі і перажыванні, песімістычныя і змрочныя адчуванні характэрны для многіх маладых людзей. Пра гэта сведчаць іх творы. Падчас гутарак высвятляецца, што свае творы не кожны гатовы вынесці на абмеркаванне, баіцца быць незразуметым і асуджаным. Але некаторыя, усё ж такі, пераадольваюць сябе. Адкрываючыся аўдыторыі, асоба як бы прыадчыняе дзверы ў свой песімістычны змрочны свет. Тут душу асобы можна параўнаць з цёмным пакоем. А адчыненыя дзверы даюць магчымасць знішчыць цемру. Пачынаецца гарманізацыя асобы, свет уяўляецца не такім змрочным і панурым. Акрамя таго, што асоба адчувае задавальненне ад пераадолення страху і няўпэўненасці, яна ўжо здольна шчыра ўсміхнуцца і чалавеку, і новаму дню. Трагічнае ўспрыняцце рэчаіснасці змяняецца на рэалістычнае, аптымістычнае ці рамантычнае.

Выступленні перад аўдыторыяй (на пасяджэннях літаратурнага клуба, у кураторскіх групах, на сустрэчах з пісьменнікамі, літаратурных вечарынах) выхоўваюць у асобы ўпэўненасць у сабе, вучаць уменню пераадольваць страх, не баяцца аўдыторыі, смела, прыгожа і правільна выказваць думкі і г. д. Аўдыторыя, як правіла, слухае

зацікаўлена, паколькі ў паэтычнай форме выказваюць свае думкі і пачуцці блізкія па ўзросце людзі, аднакурснікі, сябры, калегі. Які іх свет? Чым яны падобныя ці непадобныя да мяне? Чым яны цікавыя мне? На гэтыя і іншыя пытанні адказвае сабе аўдыторыя. Успрымаючы і ацэньваючы асобу, аўдыторыя бачыць шмат цікавага, адчувае сугучнасць многім уласным тэмам і перажываванням, а ў нечым – непадобнасць, іншы погляд, іншае бачанне звычайнага, паўсядзённага. Гэта дазваляе глыбей пазнаць свет і самога сябе, упэўніцца, што побач з табой жывуць, вучацца і працуюць вельмі непадобныя, але цікавыя і прыгожыя людзі. Песімістычна настроеныя бачаць, што яны не адзінокія ў сваім песімізме, што тут няма нічога арыгінальнага, што песімізм можна пераадолець.

Цікава праходзілі сустрэчы-прэзентацыі клуба ў куратарскіх групах. Тры-пяць студэнтаў знаёмяць групу са сваёй творчасцю. Вершы і іншыя творы выбірае сама творчая асоба, як бы прэзентуючы сябе – вось я такая, хочаце любіце – хочаце не. Шчырасць выказаных думак выклікае адпаведныя пачуцці ў слухачоў; іншы раз знаходзяцца ў групе свае паэты, якія чытаюць уласныя творы. Галоўнае – знайсці паразуменне са светам, з людзьмі, якія цябе акружаюць, і гэта паразуменне адбываецца.

Літаратура, паэзія – гэта высокія словы, вытанчаныя пачуцці, вобразы. Пошук патрэбнага слова, стварэнне вобраза развівае мову і маўленчыя навыкі, дапамагае авалодаць майстэрствам даносіць свае думкі да іншай асобы або аўдыторыі. Прэзентуючы свае лепшыя творы аўдыторыі, аўтары развіваюць у яе пачуццё прыгожага, гарманізуюць асобу.

Выступленне са сваімі творамі перад рознымі аўдыторыямі развівае аратарскае майстэрства, фарміруе ўменне наладжваць кантакт з аўдыторыяй, садзейнічае станаўленню асобы, паспяховай у прафесійнай і грамадскіх сферах, якая знаходзіцца ў згодзе з іншымі людзьмі і з самім сабой.

Выхаванне чалавека заўсёды было складанай задачай. Нават пры нармальных, стабільных стадыях развіцця грамадства ўзнікаюць розныя праблемы ў выхаванні моладзі. У перыяды змены палітычнай арыентацыі дзяржавы праблемы абвастраюцца яшчэ больш і могуць быць крыніцамі інтэнсіўных эмацыянальных усплескаў, якія прыводзяць да негатыўнага жыццёвага сцэнарыя. Праблемы сённяшняга дня (беспрацоўе, злачыннасць, разводы, алкагалізм і наркаманія, сексуальная разбэшчанасць, адсутнасць мэтаў, зрух каштоўных арыенціраў і г. д.) робяць працэс выхавання яшчэ больш цяжкім. А клубы па інтарэсах (у тым ліку і літаратурны) дапамагаюць вызначыць параметры асобы, навучыцца адаптавацца да зменлівых умоў, уменню актуалізаваць закладзеныя ў ёй патэнцыяльныя магчымасці і будаваць мадэль сацыяльна-паспяховай асобы, якая ўвесь час удасканальваецца. Гэтаму садзейнічаюць як дзейнасць самой асобы, так і тыя формы і метады, якія выкарыстоўваюцца ў клубе (работа ў розных групах як па колькасці ўдзельнікаў, так і ўзросце і сацыяльным статусе; дэмакратычныя і гуманныя адносіны да асобы; асобасныя і калектыўныя метады працы і інш.). Галоўная ўвага ўдзяляецца фарміраванню ў асобы пазітыўнай Я-канцэпцыі, развіццю волі і матывацыі, супрацоўніцтву чатырох з пяці асноўных блокаў асобы.

Падмацаваць выкладзеныя думкі дазваляюць статыстычныя звесткі па дзейнасці клуба. За 5 гадоў звыш 40 аўтараў прэзентавалі свае творы, удзельнічалі ў конкурсах розных відаў 1000 студэнтаў, над падрыхтоўкай да выдання альманахаў удзельнічала звыш 60 студэнтаў і супрацоўнікаў. Кагорту сталых членаў клуба зараз складаюць 28 студэнтаў, 3 аспіранты, 5 супрацоўнікаў, 10 выкладчыкаў. Літаратурны клуб прыцягвае ўвагу і членаў сямей супрацоўнікаў, і сяброў студэнтаў з іншых універсітэтаў.

Над стварэннем першага выпуску літаратурнага альманаха «AVE» працавалі, акрамя аўтараў, усе кафедры факультэта ВСіП (у большай або меншай ступені), усе выкладчыкі і лабаранты кафедры беларускай мовы, супрацоўнікі кафедры аналітычнай хіміі (Чарняк І.М., Яўсей А.А.), кафедры філасофіі і права (Палавец М.М.), патэнтна-інфармацыйнага аддзела (Чэрнік А.А.), студэнты ф-та ТАР. У пасяджэннях і мерапрыемствах, акрамя членаў клуба, прынялі актыўны ўдзел звыш 60-ці студэнтаў.

Праведзена: 25 пасяджэнняў, 3 сустрэчы з літаратурнымі клубамі, 1 сустрэча з літаратурнай суполкай, 1 сустрэча «Сувязь пакаленняў» з ветэранам Вялікай Айчыннай вайны (прафесар Новікаў Г.І.), 2 вечарыны. Выступілі: у пяці куратарскіх групах, на 15 вечарынах і сустрэчах, на трох юбілеях паэтаў.

Усё сказанае сведчыць аб тым, што людзям тут цікава, менавіта праз дзейнасць клуба больш поўна раскрываюцца творчыя магчымасці асобы, наладжваецца сувязь паміж пакаленнямі, рознымі ўзроставымі і статуснымі групамі насельніцтва, фарміруюцца і ўдасканальваюцца многія навыкі і ўменні.

УДК 378.18

Л.В. Жарина, доцент

## УЧАСТИЕ ФОПа В СОЦИАЛЬНОЙ АДАПТАЦИИ СТУДЕНТОВ

Such a specific means of social adaptation of the students as the Faculty of Social Professions is proposed in the article.

Факультет общественных профессий работает в нашем университете с 1968 г. Цель ФОПа – дать будущим специалистам возможность приобрести вместе с основной профессией дополнительную, что так необходимо на сегодня в условиях рынка для укрепления социальной защищенности. На сегодняшний день факультеты общественных профессий во всех институтах, в том числе и у нас, претерпели изменения. Устарело, по существу, и само название. Эта структура может быть названа «Молодежный центр информации и досуга» или как-то иначе.

На факультете можно успешно удовлетворить сегодняшние требования овладения зарубежными языками. Можно приобрести специальность референта-переводчика технической литературы по английскому, немецкому, французскому и испанскому языкам, что способствует достижению жизненного успеха. Этой же цели служит курс разговорной речи. Слушатели этих курсов имеют возможность в короткое время овладеть языками деловых людей. Это качество в сочетании с высоким уровнем освоения персональных компьютеров (такая возможность также имеется у каждого из студентов) является основой жизненного успеха.

Самым большим отделением факультета общественных профессий является отделение организаторов культурно-массовой работы. Тут действуют следующие секции: оркестр народных инструментов, вокальная группа, малые театральные формы, «Роднае слова», танцевальный коллектив. Занимаясь в этих творческих коллективах, студенты имеют возможность эстетически развиваться, реализовывать художественные способности, ощущать радость от отношений с близкими по духу людьми.

Организатор культурно-массовой работы должен быть совершенным в своем жанре, поэтому все слушатели отделения входят в состав художественных коллективов. А руководят этими коллективами квалифицированные преподаватели.

Интересной школой для слушателей ФОП является ансамбль народной песни «Рунь», которому присвоено почетное звание народного. Этот коллектив неоднократно